Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 КРАСАВІКА 2015 г. СЕРАДА № 75 (27933) Кошт 1600 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Эканамічны шлях у Індыю

СТАР. 2



## Фаліянты ад... Радзівілаў

СТАР. 6



## Мы ў чвэрцьфінале ЧС па футзале

СТАР. 10

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Анатоль КАЛІНІН, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«У 2015 годзе завяршаецца рэалізацыя пятай дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы. Ажыццяўленне мэтанакіраванай дзяржпалітыкі дазволіла вырашыць многія пытанні ў гэтым напрамку. Разам з тым, неабходнасць комплекснага вырашэння доўгачасовых задач радыяцыйнай і сацыяльнай абароны насельніцтва, далейшага зніжэння рызыкі неспрыяльных наступстваў чарнобыльскай катастрофы для здароўя грамадзян, захавання дасягнутага ўзроўню радыяцыйнай абароны насельніцтва і тэрыторый патрабуе працягу дзяржаўнай падтрымкі ў рэалізацыі названых мерапрыемстваў. У сувязі з гэтым будзе дапрацавана Дзяржаўная праграма па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі на 2016-2020 гады».*

ISSN 1990 - 763X

# РАБІЦЬ ТОЕ, ШТО ЎМЕЕШ

**Да рэспубліканскага суботніка сёлета далучыліся больш за тры мільёны жыхароў нашай краіны. Удзел у суботніку прыняў і Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы са сваёй брыгадай працаваў у сталічным мікраараёне Каменная Горка на будаўніцтве дзіцячай паліклінікі, робячы цэментна-пясчаныя сцяжкі ў памяшканнях і калідоры першага паверха. Брыгада выканала дзве дзённыя нормы. На аб'екце працавалі тры брыгады, у склад якіх уваходзілі таксама шматдзетныя сем'і.**



Фота БЕЛТА.

Плануецца, што ўсе работы па будаўніцтве паліклінікі будуць завершаны да канца гэтага года. Яна будзе ўкамплектавана найноўшым абсталяваннем, падключана да сучасных сістэм сувязі. З улікам лячэбна-дыягнастычнай базы новай паліклінікі тут плануецца адкрыццё раённага рэабілітацыйнага цэнтра для дзяцей-інвалідаў, цэнтра ранняга ўмяшання і цэнтра функцыянальнай дыягностыкі, а таксама раённага артадантычнага кабінета для дзяцей. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што гэта будзе ў нейкай ступені эксперыментальная суперпаліклініка для дзяцей. Прэзідэнт падкрэсліў, што яна будзе цалкам укамплектавана неабходным медыцынскім персаналам.

«Нам бы іншае пытанне вырашыць: каб вы шанавалі сваё здароўе. Самая вялікая праблема ў нашым грамадстве сёння: медыцынскае абслугоўванне, ахова здароўя, бясплатная (як у народзе кажуць), г.зн. чалавек прыходзіць і не плаціць, таму не жадае шанаваць сваё здароўе. Нехта напіўся, нехта курыць, а гэта галоўная прычына анкалогіі, хтосьці баіцца не тое што прабегчыся, а нават пешшу прайсціся. Я ўжо не кажу пра харчаванне», — адзначыў Прэзідэнт.

Пасля заканчэння работ Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанні журналістаў.

СТАР. 2

# Повязь Роду



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Радаўніца ў Слуцку. Таццяна ГРУНТОВІЧ з аднагадовай дачкой Сафіяй каля бабулінай магілы.*

■ На сувязі

## Тэхналогіі 5G ужо ў Мінску

### Прататыпы сувязі пятага пакалення будуць дэманстравацца на выставе ТІВО-2015

**Кожны наведвальнік экспазіцыі, якая адкрываецца сёння і будзе доўжыцца да 25 красавіка ў Футбольным манежы, зможа ацаніць, напрыклад, хуткасць запампоўкі відэа праз тэхналогію 5G — прыкладна 3,7 Гбіт у секунду. Акрамя гэтага, на выставе будзе прадстаўлены «Тэсламабіль». У форуме ўдзельнічаюць прадстаўнікі кампаній з 13 краін — усяго больш за 200 экспанентаў. Што яшчэ можна ўбачыць на выставе, расказвае першы намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Дзмітрый ШЭДКО.**



СТАР. 4

■ Надвор'е

## З ЧАЦВЯРГА ПАЦЯПЛЕЕ

### А на выхадныя сіноптыкі абяцаюць да плюс 23

**Ужо ў сераду ўдзень на тэрыторыю краіны пачнуць паступаць крыху цяплейшыя паветраныя масы з боку Скандынаўскага паўвострава, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды.**

У чацвер сапраўды пацяплее. Да нас пачне паступаць цёплая паветраная маса з боку Заходняй Еўропы. На працягу сутак чакаецца пераважна без ападкаў, аднак удзень магчыма ўзмацненне заходняга ветру, парывамі да 15-20 м/с. Тэмпература паветра ўначы на чацвер складзе 0-5 цяпла, а ўдзень — ужо плюс 11-18 градусаў, па захадзе — да 20 цяпла. І ў пятніцу прагназуецца камфортнае без ападкаў надвор'е, толькі па паўночным усходзе ўначы месцамі пройдзе кароткачасовы дождж. Тэмпература паветра ўначы на пятніцу будзе 1-7 цяпла, удзень сонейка прыгрэе да плюс 12-18 градусаў, а па поўдні — да 19-21 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, на выхадныя нас чакае ўвогуле амаль летняе надвор'е. Праўда, месцамі па краіне магчымы кароткачасовы дождж і навальніцы. Аднак тэмпература паветра ўначы складзе ўжо 3-10 цяпла, а ўдзень стане плюс 16-23 градусы. Усё, здаецца, снегу ў нас больш не будзе...

**Сяргей КУРКАЧ.**

# РАБІЦЬ ТОЕ, ШТО ЎМЕЕШ

## АБ ДЭКРЭЦЕ №3

Прэзідэнт падкрэсліў, што дакумент накіраваны супраць дармаедаў, а не сумленных людзей, якія хочуць працаваць і зарабляць. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, не варта баяцца, што пад дзеянне дэкрэта агулам трапяць і неабароненыя слаі грамадства. Прэзідэнт адзначыў, што тыя, хто знаходзіцца ў складанай сітуацыі, у прыватнасці, людзі з абмежаванымі магчымасцямі, інваліды, маюць пэўныя льготы і на іх распаўсюджваецца адпаведнае заканадаўства. «Тыя, хто працуе і дзеткак гадуе да 7 гадоў, — чаго перажываць? Ты ніякі не дармаед, расці сваіх дзяцей», — сказаў Прэзідэнт.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што цяпер акуратна і старанна адсочваецца ўся інфармацыя, у тым ліку ў СМІ, дзе выказваецца некаторая занепакоенасць з нагоды дэкрэта №3.

«Да канца года Адміністрацыя Прэзідэнта будзе маніторыць сітуацыю, каб, сапраўды, не дай Бог, ніхто незаслужана не пацярпеў ад гэтых нагрузак», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Таму не трэба перажываць і напружвацца. Усё будзе нармальна. Калі я падпісаў дакумент, гэта не значыць, што я падпісаў яго напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, каб укалоць насельніцтва. Ні ў якім разе. Я проста хачу зрабіць, як дзяржаўны чалавек, а не як палітык. Таму што або мне, або некаму пасля прэзідэнцкіх выбараў трэба працаваць. І папулізм тут недарэчны. І ўмовы павінны быць роўныя і нармальныя», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт падкрэсліў, што, прапаноўваючы гэты дэкрэт грамадству, зыходзіў з настрою тых, хто працуе. «Я не кажу, што ён ідэальны. Вы бачыце, я нават не абараняю яго. Мы глядзім, нармальны ён ці не, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Памыліліся — паправім, але трэба даць магчымасць, каб гэты дакумент папрацаваў. А затым дапрацуем. Дзе памыліліся, мы папросім прабачэння і паправім. Да канца года сітуацыю выправім».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што ўсім, хто хоча зарабіць, будзе дадзена такая магчымасць. «Не хочаш працаваць — заплаці сярэдні падатак», — сказаў Прэзідэнт. «Дык гэта мы яшчэ паўкрока зрабілі, а сапраўдны дармаед павінен думаць пра тое, што заўтра мы зробім другі крок, каб прымусіць яго працаваць», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## АБ СВЯТКАВАННІ 70-ГОДДЗЯ ПЕРАМОГІ

«Напэўна, 7-8 мая мы зможам з дэлегацыямі з Беларусі наведаць Маскву, прадэманстраваць наша адзінства з рускім народам і іншымі. Магчыма, ускладзем вянкі да магілы Невядомага салдата, як мы гэта робім. 8 мая там будуць мерапрыемствы ў рамках ЕАЭС, СНД, АДКБ, таму я, вядома, не магу не прыняць у гэтым удзелу», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што 9 мая збіраецца быць у Мінску і прымаць парад да 70-годдзя Перамогі.

Кіраўнік дзяржавы таксама растлумачыў, што ваенны парад можа прымаць толькі галоўнакамандуючы. «У нас 9 мая будзе свой такі ж парад, як у Маскве», — сказаў ён.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што не падтрымлівае палітыкаў, якія амбіцыйна адмаўляюцца прыехаць на ўрачыстасці ў гонар 70-годдзя Перамогі ў Маскву, хоць раней абяцалі.

«Па розных прычынах тыя ці іншыя лідары дзяржаў могуць адмовіцца прыехаць у гэты дзень у Маскву на ўрачыстасці. Напрыклад, калі ў іх дома адпаведныя мерапрыемствы. Мы будзем толькі рады, што разам з намі Дзень Перамогі святкуюць і ў іншых краінах. Калі ж гэта ў плане выпаду супраць Расіі і не толькі супраць Расіі, а супраць таго савецкага народа і народаў Усходняй Еўропы, якую мы вызвалялі, — гэта няправільна», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

## АБ САМАПІЯРЫ

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што з'яўляецца прыхільнікам адкрытай палітыкі. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што не трэба піярыцца на тым, што чалавек не ўмее рабіць. Ён растлумачыў, што часам яму раяць зрабіць пэўныя рэчы. «Мне кажуць: вы ведаеце, гэта трэба зрабіць, каб людзі бачылі. Я разумею, што трэба, але заўсёды кажу, што буду рабіць тое, што раблю заўсёды, таму што піярыцца і паказваць, што ты лепшы, чым ёсць, — гэта на месяц ці на паўгода, ну на год. Але я 20 гадоў Прэзідэнт, і гэта даўно вылезла б», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Можаш — рабі, не можаш — не рабі, — дадаў ён. — Не трэба рабіць тое, што ты не ўмееш рабіць, толькі дзеля таго, каб прапіярыцца».

**Паводле БЕЛТА.**




**Дзіцячая паліклініка ў Каменнай Горцы будзе разлічана на 480 наведванняў за змену.**

## Медыцына і помнікі — у прыярытэце

**Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандра КОСІНЦА журналісты заспелі падчас працы на будоўлі сярэдняй школы №32 горада Мінска ў мікрараёне Лебядзіны. Гэта будзе школа на 1020 месцаў, яе будаўніцтва павінна завяршыцца сёлета ў ліпені, і ўжо першага верасня яна прыме сваіх першых вучняў.**

Аляксандр Косінец адзначыў, што сёлетні рэспубліканскі суботнік незвычайны, бо праходзіць у год 70-годдзя Перамогі і ў Год моладзі. Ён прызнаўся, што падчас такіх мерапрыемстваў заўсёды мае добры настрой, і падкрэсліў, што рэспубліканскія суботнікі сталі добрай традыцыяй, якая аб'ядноўвае і гуртуе ўсю нацыю.

«Палова зароблены на суботніку грашовых сродкаў пойдзе на тое, каб забяспечыць лячэбна-прафілактычныя ўстановы Беларусі медыцынскім абсталяваннем, — паведаміў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Перш за ўсё гэта робіцца для дзяцей, каб у выніку мы атрымалі эфектыўнае аказанне ім медыцынскай дапамогі. Другая палова будзе адпраўлена ў мясцовыя выканкамы для аднаўлення абеліскаў, помнікаў, а таксама для падрыхтоўкі дзіцячых летніх месцаў адпачынку».

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

## 61 МІЛЬЯРД РУБЛЁЎ

### зарабілі беларусы на сёлетнім суботніку

**Такую лічбу агучыла намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА падчас падвядзення вынікаў рэспубліканскай акцыі. «Разам з тым выпушчана прамысловай прадукцыі на суму 152 мільярды рублёў, а аб'ёмы падрадных работ склалі 28 мільярдаў», — паведаміла Наталля Іванаўна.**

Больш за ўсіх зарабілі мінчане (з іх удзел у мерапрыемстве прынялі 487 тысяч чалавек) — 20 мільярдаў рублёў. 400 тысяч прадстаўнікоў Мінскай вобласці сабралі 6,7 мільярда. Прыкладна па 7 мільярдаў унеслі жыхары Магілёўшчыны і Брэстчыны, дзе ўладкоўваць тэрыторыю рэгіёнаў выйшлі 349 і 487 тысяч чалавек адпаведна. У Віцебскай вобласці 371 тысяча работнікаў сабрала 4,5 мільярда рублёў. Унёсак Гродзеншчыны, дзе на суботнік выйшлі 334 тысячы чалавек, ацэньваецца ў 5,2 мільярда. Амаль на 4 мільярды больш зарабілі ў Гомельскай вобласці (там да рэспубліканскай акцыі далучылася 501 тысяча чалавек).

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**



■ Погляд

# ЭКАНАМІЧНЫ ШЛЯХ У ІНДЫЮ

## Беларускім вытворцам варта імкнуцца да ўдзелу ў індыйскіх урадавых праграмах

**Індыя з'яўляецца даўнім добрым сябрам Беларусі. У нас яшчэ з часоў БССР наладзіліся добразычлівыя адносіны, якія пасля распаду СССР перараслі ў паважлівыя, раўнапраўныя двухбаковыя стасункі дзвюх суверэнных дзяржаў. Уступленне Беларусі ў Рух недалучэння, адным з ініцыятараў стварэння якога была ў свой час Індыя, яшчэ больш палепшыла нашы адносіны.**

Насельніцтва Індыі імкліва расце, і цягам некалькіх гадоў Індыя можа з другога месца ў свеце выйсці на першае па гэтым паказчыку. У 2015 годзе чакаецца рост эканомікі Індыі ў 7-8 працэнтаў, што ўпершыню за многія гады дазволіць краіне абагнаць свайго рэгіянальнага суседа — Кітай — па тэмпах эканамічнага росту. Гэта таксама выведзе Індыю ў лік эканомік з найбольш хуткім ростам у свеце. Важным фактарам развіцця індыйскай эканомікі з'яўляецца прыход у 2014 годзе да ўлады новага прэм'ер-міністра — выдатнага менеджара і інаватара Нарэндры Модзі. Ён схільны ўкараняць у краіне тыя элементы, якія зрабілі ў свой час кітайскую эканоміку вельмі эфектыўнай.

Улічваючы, што беларуска-індыйскія адносіны ў палітычнай сферы з'яўляюцца ўзорнымі, галоўны ўпор у далейшым развіцці адносін робіцца на эканоміку, навуку і сацыяльна-культурныя аспекты.

У эканамічным супрацоўніцтве належыць зрабіць яшчэ вельмі шмат. Таваразварот, які ўсталяваўся ў памеры каля паўмільярда долараў у год, зусім не адпавядае патэнцыялу развіцця нашых адносін. Адным з ключавых фактараў абмежавання збыту беларускіх тавараў на індыйскім рынку была закрытасць індыйскага рынку для імпарцёраў. Новы індыйскі ўрад распачынае крокі па выпраўленні сітуацыі, што можа дапамагчы беларускім экспарцёрам больш энергічна асвойваць гэты рынак. Добрым стымулам для развіцця беларускага экспарту ў Індыю сталі праблемы са збытам беларускіх тавараў на расійскім рынку з-за падзення расійскай эканомікі.

Ёсць і разуменне таго, што дапамагчы ў росце таваразвароту можна на ўрадавым узроўні. У прыватнасці, спрыянне беларускім экспарцёрам было адной з галоўных задач афіцыйнага візіту ў Рэспубліку Індыя беларускай дэлегацыі на чале з міністрам замежных спраў Рэспублікі Беларусь Уладзімірам Макеем, які адбыўся 14—15 красавіка. У складзе беларускай дэлегацыі былі кіраўнікі БелАЗа, Мінскага трактарнага завода, Беларускай калійнай кампаніі, што сведчыць пра імкненне гэтых прадпрыемстваў палепшыць свае продажы на індыйскім рынку.

Бакі пагадзіліся, што развіццю эканамічных сувязяў будзе спрыяць правядзенне чарговага пасяджэння беларуска-індыйскай міжурадавай камісіі па гандлёвым і эканамічным супрацоўніцтве і Савета дзелавога супрацоўніцтва «Беларусь — Індыя». На гэтых сустрэчах плануецца распрацаваць праекты, накіраваныя на актывізацыю гандлёва-эканамічнага, інвестыцыйнага і фінансавага ўзаемадзеяння, а таксама знайсці іншыя магчымасці для развіцця дзелавых сувязяў.

Перспектыўным кірункам для развіцця супрацоўніцтва ў сферы эканомікі могуць стаць буйныя праграмы па развіцці Індыі, арганізаваныя новым урадам Модзі. У прыватнасці, з 2014 года індыйскі ўрад займаецца рэалізацыяй праграмы «Чыстая Індыя». Прэм'ер-міністр Модзі імкнецца да таго, каб да 2019 года па ўсёй Індыі вуліцы сталі чыстымі, а кожны індыец атрымаў доступ да чыстай пітной вады і абзавёўся асабістай прыбіральняй, на што спатрэбіцца каля 33 мільярдаў долараў. Рэалізацыя гэтай праграмы ставарае выдатныя магчымасці па павелічэнні экспарту прадукцыі «Керамінам» і іншымі беларускімі прадпрыемствамі, якія працуюць у гэтай сферы. У новым бюджэце краіны таксама будуць павялічаны выдаткі на аўтамабільныя дарогі, чыгунку і электрычнасць, што ставарае магчымасці для беларускіх кампаній, якія прадстаўляюць паслугі за мяжой па гэтых кірунках.

У галіне навуковага супрацоўніцтва робіцца ўпор на фармацэўтыку, інфармацыйныя тэхналогіі і кібербяспеку, нанатэхналогіі і нанаматэрыялы, фатоніку, экалогію і рацыянальнае прыродакарыстанне, узнаўляльныя крыніцы энергіі. Па выніках пасяджэння сумеснай беларуска-індыйскай камісіі па супрацоўніцтве ў галіне навукі і тэхнікі, якое праходзіла ў Нью-Дэлі летась, была прынята Выканаўчая праграма беларуска-індыйскага супрацоўніцтва ў галіне навукі і тэхнікі на 2015-2017 гады. Праграма дазволіць развіваць адносіны беларускіх і індыйскіх вучоных у гэтых і сумежных сферах. Было таксама вырашана, што Індыя будзе штогод выдзяляць стыпендыі маладым вучоным з Беларусі. Не будзем забываць і пра тое, што ў 2012 годзе адбылося адкрыццё беларуска-індыйскага навучальнага цэнтра ў вобласці ІКТ на базе Парка высокіх тэхналогій, што вывела супрацоўніцтва ў гэтай важнай для развіцця эканомікі сферы на новы ўзровень.

Для развіцця адносін у сферы культуры і грамадскіх сувязяў няма ніякіх перашкод. Добрыя перспектывы ёсць ва ўзаемным супрацоўніцтве нацыянальных бібліятэк, у абмене фільмамі і фальклорнымі калектывамі.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

■

## СЕНАТАРЫ ДАПАМАГЛІ БУДАЎНІЦТВУ БАЛЬНІЦЫ

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу падчас рэспубліканскага суботніка ўдзельнічалі ў будаўніцтве аднаго з карпусоў 4-й гарадской клінічнай бальніцы імя Саўчанкі ў Мінску.

**Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** падкрэсліў, што суботнікі заўсёды былі накіраваны на ўдзел грамадзян краіны ў будаўніцтве сацыяльна значных аб'ектаў. «Гэта не проста прагулка на свежым паветры, гэта сапраўды сур'ёзныя будаўнічыя работы, якія дазваляюць дапамагчы будаўнікам і ў пэўнай ступені па-іншаму паглядзець на іх працу і тыя аб'екты, якія будуюцца. Як правіла, гэта сацыяльныя аб'екты, якія ўзводзяцца за кошт бюджэтных сродкаў. Гэта дазваляе больш глыбока асэнсаваць, што робіцца ў сферы матэрыяльнай вытворчасці», — лічыць старшыня Савета Рэспублікі.

**Галоўны ўрач 4-й гарадской клінічнай бальніцы Аляксандр ТРАЯНАЎ** падкрэсліў, што будаўніцтва тэрапеўтычнага корпуса, дзе праходзіў суботнік, неабходна гораду, каб папоўніць дэфіцыт у кардыялагічных ложках.

## ДЭПУТАТЫ ЗАЛАЖЫЛІ ПАРК

«Сумесная праца яднае людзей, яны больш даведваюцца адзін пра аднаго, больш размаўляюць, абмяркоўваюць праблемы, а ў наш час гэта вельмі важна», — адзначыў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** падчас рэспубліканскага суботніка. Дэпутаты ніжняй палаты беларускага парламента высадзілі болей за тры дзясяткі дрэў у парку імя Уга Чавеса ў Фрунзенскім раёне Мінска.

Спікер ніжняй палаты беларускага парламента заўважыў, што ў падобных мерапрыемствах актыўны ўдзел бяруць беларусы ўсіх узростаў. «Для многіх людзей, асабліва старэйшага пакалення, удзел у суботніках — гэта асаблівы момант, традыцыя, і вельмі прыемна, што ў апошні час у суботніках удзельнічае шмат моладзі і школьнікаў», — сказаў ён.

Пра тое, як раней праходзілі суботнікі, згадвала Наталля Кучынская, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, навуцы і культуры: «Гэта было сапраўднае свята. Усе — малыя і сталыя — выходзілі на вуліцу і стварялі прыгажосць на сваёй зямлі». На яе думку, гэтая традыцыя бярэ свой пачатак яшчэ з талакі. Калі людзі збіраліся разам і рабілі непад'ёмную для адной сям'і працу ўсёй вёскай. Таму Наталля Генадзеўна ўпэўнена, што галоўнае ў суботніку — гэта не толькі збор грошай, але і непасрэдная праца кожнага.

## АДНАЎЛЯЮЧЫ БАГАЦЦЕ

Падчас рэспубліканскага суботніка **прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ,** прадстаўнікі апарату Савета Міністраў і лясной гаспадаркі садзілі лес. На плошчы 1,4 га выпрацаванага кар'ера «Валяр'яны», што знаходзіцца на тэрыторыі Лашанскага лясніцтва Уздзенскага лягсаса, члены ўрада высадзілі каля 8000 маладых сосен.

— Падчас суботнікаў важны не сам факт працы ў выхадны дзень, але тое, што людзі сапраўды адчуваюць жаданне папрацаваць на агульны вынік, а таксама мець зносіны са сваімі супрацоўнікамі, але не ў звыклых відах дзейнасці, а на прыродзе, выконваючы важную сацыяльна карысную функцыю, — адзначыў Андрэй Кабякоў. — Я б такія суботнікі, хоць яны і напружаныя ў плане фізічнай працы, не называў дадатковым працоўным днём — гэта проста вялікае задавальненне, але з потам і мазалямі.

Па словах прэм'ер-міністра, сёлетні рэспубліканскі суботнік — своеасаблівы працяг «ляснога тыдня», прысвечанага 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, падчас якога было пасаджана каля 70 млн дрэў.

Падчас суботніка прэм'ер-міністр таксама азнаёміўся са станам лясной галіны і перспектывамі яе развіцця.

— Самая галоўная перспектыва — увесь лес, які ў нас выспявае, мы павінны цалкам перапрацоўваць, — сказаў Андрэй Кабякоў. — І перапрацоўваць так, каб атрымаць прадукцыю з высокай дабаўленай вартасцю. На гэта і накіравана праграма мадэрнізацыі дрэваапрацоўчай галіны.

# ПРАЦАВАЛІ ТАЛАКОЙ

## У рэспубліканскім суботніку ўзялі ўдзел працоўныя калектывы і кіраўніцтва ўсіх рэгіёнаў краіны



Суботнік на базе 4-й гарадской клінічнай бальніцы імя Саўчанкі ў Мінску.

Фота БЕЛТА.

## РАБІНЫ Ў ЦЫТАДЭЛІ

У Брэсцкай вобласці адным з цэнтральных аб'ектаў рэспубліканскага суботніка стаў мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», паведамляе БЕЛТА. Папрацаваць на карысць знакавага гістарычнага месца выйшлі работнікі **Брэсцкага аблвыканкама на чале з яго старшынёй Анатолем ЛІСАМ,** гарадскі актыў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, прадстаўнікі расійскага консульства — усяго больш за 200 чалавек. Асноўная маса ўдзельнікаў суботніка працавала на добраўпарадкаванні тэрыторыі крэпасці — чысцілі берагі абводнага канала і Заходняга Буга ад зараснікаў і паваленых дрэў. Анатоль Ліс узначаліў групу работнікаў аблвыканкама, занятую на пасадцы сквера ля Паўночных варот крэпасці. У памяць пра юбілей Перамогі тут высаджана 70 рабін. Яны дапоўнілі і ўшчыльнілі невялікае насаджэнне бяроз, якое ўжо існуе ў гэтым месцы. Такім чынам, з часам наведвальнікі цытадэлі змогуць адпачыць у цені бярозава-рабінавага гаю.

## НАРОДНАЯ ТРАДЫЦЫЯ

На Віцебшчыне ў рэспубліканскім суботніку ўдзельнічалі каля 400 тысяч чалавек. Сярод іх прыблізна 70 тысяч студэнтаў, навучэнцаў, беспрацоўных і пенсіянераў.

Жыхары Віцебска Генадзь і Галіна Дзямешчанкі — актыўныя пенсіянеры, якія заўсёды ідуць на суботнік, як на свята.

— Жывём недалёка ад сквера, дзе сёння працуем. З задавальненнем высаджваем дрэвы не толькі падчас суботнікаў. Дакладна не лічылі, але «за намі» ўжо прыблізна 300 дрэў. Сёлета высадзілі каля 25. Дапамагаем камунальнікам азеляняць горад, стварасць прыгажосць. І двор наш добраўпарадкоўваем, — распавядае карэспандэнту «Звязды» **ваенны пенсіянер Генадзь ДЗЯМЕШЧАНКА.**

Муж і жонка працавалі на суботніку ў скверы, які плануюць назваць у гонар юбілею Перамогі. Знаходзіцца ён на аднайменным праспекце — у новым мікраёне.

**Мікалай ШАРСТНЁЎ, старшыня Віцебскага аблвыканкама,** яго намеснікі і іншыя адказныя асобы высадзілі ў скверы 110 дрэў.

— Сквер гэты ствараецца для мясцовых жыхароў, каб яны адпачывалі недалёка ад сваіх дамоў. І трэба зрабіць, каб мамы з калясkамі маглі тут пагуляць, дзеці, хлопцы і дзяўчаты знайшлі сабе занятак па душы... Таму трэба, каб у вялікай па плошчы новай «зялёнай зоне» ў выхадныя і святочныя дні арганізоўвалі выязны гандаль, забаўляльныя праграмы. Магчыма, тут неабходна пабудаваць фантан. А мо размясціць малую архітэктурную форму. У любым выпадку неабходны нейкі элемент, які б нагадваў пра тое, што сквер створаны ў гонар знамянальнай падзеі, — сказаў старшыня аблвыканкама, падкрэсліўшы, што кожны новы мікраён павінен мець сквер, парк. І важна, каб яны чымсьці адрозніваліся ад іншых.

## ТУТ ПАЧЫНАЛАСЯ ВЫЗВАЛЕННЕ

**Старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК** разам са сваімі намеснікамі ўдзельнічаў у работах па рэканструкцыі цэнтральнай плошчы гарадскога пасёлка Лоеў. Тут заканчваецца рэканструкцыя мемарыяльнага комплексу, прысвечанага подзвігу савецкіх воінаў, якія сталі ўдзельнікамі бітвы за Днянро ў 1943 годзе. Гэтая ваенная аперацыя паклала пачатак вызваленню Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Мемарыял плануецца адкрыць да 70-годдзя Вялікай Перамогі.

Працоўныя дэсанты прадстаўнікоў мясцовых органаў улады ва ўсіх раёнах вобласці займаліся добраўпарадкаваннем. Напрыклад, у Жлобінскім раёне — мемарыяльнага комплексу ў Чырвоным Беразе, у Гомельскім — на тэрыторыі дзіцячых аздараўленчых летнікаў «Хваёвы бор» і «Сожскі бераг»... Супрацоўнікі гомельскага гарвыканкама працавалі на рэканструкцыі помніка камсамольцам-падпольшчыкам у Цэнтральным раёне горада. Ва ўсіх раёнах горада над Сожам з'явіліся алеі, пасаджаныя студэнтамі гомельскіх ВНУ.

## ДАПАМАГЛІ БУДАЎНІКАМ

**Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ,** іншыя работнікі органаў выканаўчай і прадстаўнічай улады ў гэты дзень працавалі на будаўніцтве новай школы ў мікраёне «Вішнявец» абласнога цэнтра. Супрацоўнікі гарвыканкама дапамагалі будаўнікам на ўзвядзенні яшчэ аднаго важнага аб'екта сёлетняй сацыяльнай праграмы — дзіцячага садка ў тым жа мікраёне. А на Кургане Славы ў Гродне ветэраны і члены БРСМ заклалі алею ў гонар 70-годдзя Вялікай Перамогі — высадзілі 70 кустоў бэзу.

## АЛЕЯ ПАМЯЦІ

Ліпавая алея з'явілася падчас рэспубліканскага суботніка на сімвалічным для кожнага жыхара Магілёўскай вобласці месцы — Буйніцкім полі. 70 дрэў, пасаджаных рукамі кіраўнікоў вобласці і горада, прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў, ветэранаў, моладзі сімвалізуюць сабой 70 мірных гадоў пасля вайны.

— Хай гэтая алея стане сімвалам мужнасці, нязломнасці і самаахвярнасці нашага народа. Упэўнены, што нашы нашчадкі зберагуць яе як напамін аб страшнай трагедыі XX стагоддзя і вялікім подзвігу сваіх продкаў, — адзначыў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ.**

Яшчэ адной з галоўных пляцовак суботніка, на якой таксама працавалі кіраўнікі вобласці, стаў хоспіс Магілёўскай анкалагічнай бальніцы. Рэканструкцыя карпусоў па вуліцы Піянерскай вядзецца трэці год і ўступіла ў завяршальную стадыю. Плануецца, што ўжо сёлета хоспіс прыме першых пацыентаў.

## ДОБРА, КАЛІ ДРУЖНА

**Кіраўніцтва Мінскага абласнога выканаўчага камітэта разам са старшынёй Сямёнам ШАПІРАМ** дапамагалі камунальнаму сельскагаспадарчаму прадпрыемству «Племптушказавод «Беларускі», што ў Мінскім раёне. А менавіта, забетанавалі падлогу ў памяшканні для ўтрымання буйной рагатай жывёлы, якое ўступіць у строй летам гэтага года. Разам з тым прадстаўнікі аблвыканкама займаліся добраўпарадкаваннем тэрыторыі фермы, фарбаваннем агароджы і пабелкай будынкаў.

У супрацоўнікаў галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама быў іншы, не менш адказны ўчастак работы. Разам з Мінскім абласным аб'яднаннем прафсаюзаў і арганізацыямі галіновых прафсаюзаў яны добраўпарадкавалі Курган Славы. А тым часам грамадскасць Міншчыны даводзіла да ладу тэрыторыю мемарыяльнага комплексу «Хатынь».

Суботнік прайшоў дружна і зладжана, паколькі яшчэ напярэдадні на нарадзе рабочай групы былі вызначаны аб'екты і аб'ёмы работ, створаны абласны грамадскі прэс-цэнтр. Аналагічная работа праведзена і на ўзроўні раённых і Жодзінскага гарадскога выканкамаў.

## НЕАСАБІСТАЯ СПРАВА

Работнікі Мінгарвыканкама і яго структурных падраздзяленняў падчас рэспубліканскага суботніка дапамагалі будаўнікам узводзіць мемарыяльны комплекс «Трасцянец» і прыводзілі ў парадак прылеглую да яго тэрыторыю, паведамляе агенцтва «Мінск-Навіны».

— Упэўнены, мемарыял стане не проста ўпрыгажэннем горада: сюды будуць прыходзіць мінчане і прыязджаць жыхары ўсіх рэгіёнаў Беларусі, іншых дзяржаў, каб аддаць даніну памяці ахвярам фашызму, што загінулі тут у гады Вялікай Айчыннай вайны, — адзначыў **старшыня Мінскага гарвыканкама Андрэй ШОРАЦ.** — Зробленыя сродкі накіруем на будаўніцтва мемарыяла, а таксама на аздараўленне дзяцей. У цэлым па выніках мінулага месячніка па добраўпарадкаванні горад стаў прыкметна чысцейшым, прыгажэйшым, больш акуратным. Мы робім усё для таго, каб гараджане разумелі: дом — гэта не толькі кватэра, але і пад'езд, двор, прылеглая тэрыторыя. Таму кожны з нас не павінен заставацца абыякавым да таго, што адбываецца навокал.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Вераніка ПУСТАВІТ, Вераніка КОЛАСАВА, Аляксандр ПУКШАНСКІ, Ірына АСТАШКЕВІЧ, Барыс ПРАКОПЧЫК, Нэлі ЗІГУЛЯ, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# Тэхналогіі 5G ужо ў Мінску

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**— Чым удзельнікі будуць здзіўляць?**

— Як і на мінулых выстаўках будуць прадстаўлены розныя апаратныя рашэнні — і прылады, якімі мы карыстаемся ў сваім жыцці кожны дзень, і навінкі, якія на наш рынак яшчэ не выйшлі, але ў бліжэйшы час павінны на ім з'явіцца. Маштаб — ад тэлефона да тэлевізара. Напрыклад, мы разлічваем, што нашы карэйскія калегі прадэманструюць прататыпы сувязі пятага пакалення. Гэта яшчэ нават не стандарт, а толькі навуковая распрацоўка, але дзейная мадэль ужо ёсць. Наведвальнікі змогуць іх памацаць і выпрабаваць. Афіцыйнае ўкараненне тэхналогіі запланавана Міжнародным саюзам электрасувязі толькі на 2018 год. Але я думаю, што некаторыя краіны, у тым ліку Паўднёвая Карэя, будуць укараняць гэтыя тэхналогіі да атрымання міжнароднага стандарта, каб усё добра пратэсціраваць.

**— Калі не памыляюся, раней прадстаўнікі Карэі не ўдзельнічалі ў нашай выставе?**

— Сапраўды, сёлета ўпершыню ў нас ёсць, так бы мовіць, нацыянальны госць выставы — стэнд Рэспублікі Карэя. Там будзе прадстаўлена адразу пяць карпарацый. У нас наладзіліся вельмі нядрэнныя адносіны. У рамках форуму мы таксама падпішам Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж нашымі профільнымі міністэрствамі.

**— Ці значыць гэта, што мы зможам выкарыстоўваць іх тэхналогіі ў нашай вытворчасці?**

— Карэйцы, з аднаго боку, вельмі адкрытыя людзі і гатовы актыўна супрацоўнічаць з іншымі дзяржавамі, аднак насамрэч у іх тут ёсць чыста практычны інтарэс. Ім цікава наладзіць кантакты з беларускімі распрацоўшчыкамі праграмнага забеспячэння. У карэйцаў вельмі добра атрымліваецца рабіць «жалеза», а вось «начынку» могуць выдатна ствараць беларуская праграмісты. Таму ў будучыні гаворка можа зайсці і пра лакалізацыю ў нашай краіне пэўных тэхналогій альбо пра сумесныя распрацоўкі.

**— Ці будзеце неяк адзначаць 20-годдзе «Белтэлекама» і «Белпошты»?**

— Вядома. Будзем падводзіць вынікі працы гэтых найбуйнейшых дзяржпрадпрыемстваў за два дзесяцігоддзі. Напрыклад, «Белтэлекам» прайшоў шлях ад dial-up — сэрвісу, які дазваляе камп'ютару, выкарыстоўваючы мадэм і тэлефонную сетку агульнага карыстання, далучацца да іншага камп'ютара для перадачы даных (напрыклад, для доступу ў інтэрнэт), да сучаснага оптавалакна — шкловалаконнага кабелю, які выкарыстоўваецца для перадачы вялікіх аб'ёмаў інфармацыі з дапамогай светлавых імпульсаў. Гэта тысячаразовы рост хуткасцяў і, адпаведна, якасці абслугоўвання. Вельмі высокія вынікі ў нас ва ўкараненні IP-тэлебачання. Звычайна такія праекты рэалізуюцца ў больш густанаселеных краінах, таму гэта ўнікальна для Беларусі. Будзе таксама прадстаўлена новая паслуга — ОТТ-тэлебачанне. Гэта зручны сэрвіс, які дазваляе глядзець любімыя фільмы і праграмы на розных прыладах (планшэт, смартфон) толькі пры дапамозе інтэрнэт-злучэння. «Белпошта» ў рамках сваёй экспазіцыі робіць акцэнт на 70-годдзі Перамогі. Да гэтага прымеркавана і новая маркавая прадукцыя, паштоўкі.

**— Што стане цэнтрам экспазіцыі?**

— Калектыўны стэнд Мінсувязі. Аснову будзе складаць своеасаблівая справаздача аб тым, што было зроблена для ўкаранення электроннага ўрада за апошнія 5 гадоў. Сёлета таксама завяршаецца рэалізацыя дзяржпраграмы ў сферы паслуг ІКТ. Будзе прадстаўлены і Дзяржаўны каранёвы засведчвальны цэнтр, дзе займаюцца электронна-лічбавым подпісам. Можна будзе прама на выставе паглядзець, што гэта такое. Будзем паказваць і абмяркоўваць тэхналогіі «электроннага рэцэпта». Для яго ўкаранення неабходна стварэнне інфармацыйнай прасторы ўсёй сістэмы аховы здароўя. Бо для таго, каб выпісаць і апрацаваць адзін рэцэпт, спатрэбіцца аб'яднаць і сістэму ідэнтыфікацыі, і цэлы шэраг баз даных — ад урачоў да фармацэўтаў.

**— А тэму лічбавага тэлебачання закранеце?**

— Безумоўна, бо 15 мая для нас — фінальная дата існавання аналагавага тэлебачання ў Беларусі. Большая частка краіны ўжо глядзіць выключна лічбавае тэлебачанне, але «перарэзанне стужачкі наадварот» абавязкова адбудзецца. Мы будзем дэманстраваць і ўсю лінейку апаратных рашэнняў, распрацаваных за апошнія гады — прыёмнікі, дэкодары, перадатчыкі. Яшчэ раз пакажам розніцу паміж аналагавым вяшчаннем і «лічбай».

**— Пра «разумны дом», відаць, таксама нешта раскажуць...**

— Адразу некалькі кампаній будуць дэманстраваць рашэнні для сістэмы «разумны дом» або «разумны горад», у тым ліку і канцэпцыі «інтэрнэту рэчаў» — вылічальнай сеткі фізічных аб'ектаў («рэчаў»), аснашчаных убудаванымі тэхналогіямі для ўзаемадзеяння адзін з адным або са знешнім асяроддзем, што выключае з часткі дзеянняў і аперацый неабходнасць удзелу чалавека. Канцэпцыя сфармулявана ў 1999 годзе як асэнсаванне перспектыў шырокага прымянення сродкаў радыёчастотнай ідэнтыфікацыі для ўзаемадзеяння фізічных аб'ектаў паміж сабой і з вонкавым асяроддзем. На выставе будзе прадстаўлена наша распрацоўка, якая ўжо зацікавіла партнёраў па ЕАЭС. Гэта сістэма маніторынгу лагістычных плыняў. Аснова — радыёчастотная ідэнтыфікацыя. Гэта больш сучасная замена штрых-кода, якая дазваляе вельмі рэзка паскорыць апрацоўку грузаў, павялічыць дакладнасць уліку. Вы заходзіце на склад — і вам на прыладу прыходзяць сігналы ад грузаў. Такім чынам вы праводзіце аператыўную інвентарызацыю. Падобную сістэму можна выкарыстоўваць таксама ў сістэме ЖКГ — аўтаматызаваны ўлік і здыманне паказанняў з лічыльнікаў. Чалавеку не трэба будзе кожны месяц тэлефанаваць і паведамляць паказанні. Людзям зручна, а ЖКГ выгадна — улік аператыўны і максімальна дакладны.



Фота Надзеі БУЖАН.

**— У чым галоўная задача выставы?**

— Правядзенне кангрэса TIBO. Нам важна высветліць, як правільна ўкараніць новыя тэхналогіі ў нашай краіне. Гэта будзе стартавы пункт для абмеркавання стратэгіі пабудовы інфармацыйнага грамадства на наступныя 5 гадоў, у якой шмат гаворыцца пра развіццё інфраструктуры.

**— Што ж сёння значыць для беларуса «быць на сувязі»?**

— Мы ўжо прыйшлі да таго, што сувязь для любога чалавека — гэта тры асноўныя ўмовы: інтэрнэт, тэлефон і тэлебачанне. І калі хоць з адным са складнікаў нешта здараецца, у людзей тут жа ўзнікае вельмі бурная незадаволенасць. Паўгадзіны адсутнасці сувязі для сучаснага чалавека — гэта сур'ёзны стрэс. Істотна выраслі і патрабаванні спажыўцоў да якасці. А мадэрнізацыя тэлекамунікацыйнай галіны бясконцая. Мы не можам сказаць, што дасягнулі нейкай кропкі. Гэта абсалютна пастаянны працэс. Сёння ён проста больш заўважны, таму што ідзе замена тэхналогіі ADSL на GPON, якая дазваляе ствараць умовы для радыкальнага паляпшэння якасці паслуг.

* * *

Адкрываць выставу будзе прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй Кабякоў. Прымуць удзел у адкрыцці два высокія госці — намеснік генеральнага сакратара ААН па эканамічных і сацыяльных пытаннях Ву Ханбо і генеральны дырэктар ААН па прамысловым развіцці Юн Лі.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

# КОЛЕРЫ СЛАВЫ — СІНІ І БЕЛЫ

**У Мінску стартавала акцыя «Цяльняшка — наша легенда». Падчас яе ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і сённяшнія вайскоўцы ўзгадалі пра савецкі ваенна-марскі сцяг, бесказырку, цяльняшку і, вядома, сам подзвіг маракоў СССР.**

Са слоў арганізатара акцыі і кіраўніка грамадска-патрыятычнага аб'яднання «Марское братэрства — непарушнае!» Арсенія Крыцкага, перамога ў маі 1945-га была немагчымая без удзелу флатылії. Дэсантнікаў падчас Берлінскай аперацыі праз раку Шпрэе перавозілі на драўляных караблях матросы Днепроўскага (Пінскага) флоту. Менавіта яны ўстанавілі ў Рэйхстагу савецкі ваенна-марскі сцяг у памяць аб усіх палеглых мараках. На жаль, пра іх удзел у ваенных аперацыях Вялікай Айчыннай вайны мы ведаем няшмат.

На пачатку вайны па загадзе адмірала Мікалая Кузняцова каля 500 тысяч маракоў сышлі на бераг і сталі змагацца на роўных з астатнімі байцамі. Яны праявілі такую мужнасць, што немцы часта называлі прадстаўнікоў флоту «чорная смерць». Толькі за наяўнасць цяльняшкі нацысты расстрэльвалі параненых байцоў. «Іх баяліся настолькі, што казалі: марака трэба забіваць двойчы», — тлумачыць Арсеній Крыцкі.

У акцыі таксама ўзялі ўдзел ветэраны Вялікай Айчыннай вайны з Расіі і Беларусі. «Цяльняшка — гэта сімвал марской доблесці», — кажа Станіслаў Звяздоў, кавалер ордэна Айчыннай вайны, апошні член экіпажа легендарнай падводнай лодкі «С-13» пад кіраўніцтвам Аляксандра Марынескі.

Таксама акцыю наведаў кіраўнік музея імя Дняпроўскай флатыліі ў Пінску, капітан першага рангу Анатоль Азёраў. Мясцовы Савет ветэранаў ваенных маракоў стварыў музей сваімі сіламі. На яго базе сталыя героі-маракі арганізавалі клуб юных маракоў, з якога ўжо 4 чалавекі вырашылі звязаць свой жыццёвы шлях з флотам.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**


## Информационное сообщение

о проведении аукциона на право заключения договоров аренды земельного участка для строительства и обслуживания торгово-развлекательного центра в северо-западном районе г. Смолевичи Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | г. Смолевичи, ул.Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 28.05.2015 г. в 11-00 |
| 3 | Продавец и его адрес | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот №1 – площадь 1,4947 га, кадастровый номер 624850100005000761, северо-западный район г. Смолевичи Минской области |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Лот №1 – для строительства и обслуживания торгово-развлекательного центра |
| 7 | Сроки аренды | Лот № 1 – 99 (девяноста девять) лет |
| 8 | Сроки заключения договора аренды | После оплаты стоимости предмета аукциона в течение 2 рабочих дней |
| 9 | Начальная (стартовая) цена продажи | Лот № 1 – 2 000 000 000 рублей |
| 10 | Условия аукциона | продажа по цене не ниже начальной;<br>участниками аукциона могут быть индивидуальные предприниматели, юридические лица;<br>возместить в установленном порядке затраты на проведение аукциона, убытки открытому акционерному обществу «Смолевичи Бройлер» в сумме 11 968,715 тыс. рублей;<br>потери сельскохозяйственного производства в сумме 419 408,800 тыс. рублей, вызванные изъятием 1,4947 га сельскохозяйственных земель |
| 11 | Наличие инженерной инфраструктуры | Лот № 1 – Электроснабжение, газоснабжение, водоснабжение |
| 12 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона 100% оплата |
| 13 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной (стартовой) цены продажи р/с 3641000000205 ЦБУ 621 филиала № 616 АСБ «Беларусбанк», г. Жодино, код 812, УНП 600014139, ОКПУ 04064735, назначение платежа 04002. |

**Затраты на организацию и проведение аукциона в том числе (изготовление землеустроительного дела, осуществление государственной регистрации создания земельного участка, публикация информационного сообщения, изготовление градостроительного паспорта) подлежат возмещению победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона.**

**Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком - каждый четверг с 9.00 – 13.00.**

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Подлесная, д.11, каб. № 8.**

**Окончательный срок приема заявлений – 22.05.2015 г. 17.00.**

**Контактный телефон (8-01776) 55-3-42.**

**Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:**

- заявление на участие в аукционе;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели и юридические лица, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом в его участии.**



## Информационное сообщение

о проведении аукциона на право заключения договоров аренды земельного участка для строительства и обслуживание многоквартирного жилого дома в г. Смолевичи, ул. Центральная, д. 20б

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком, зал заседаний, 28.05.2015 г. в 11-00 |
| 3 | Продавец и его адрес | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот №1 – площадь 0,0320 га, кадастровый номер 624850100001000903 г. Смолевичи, ул. Центральная, д. 20б |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Лот №1 – для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома |
| 7 | Сроки аренды | Лот № 1 – 99 (девяноста девять) лет |
| 8 | Сроки заключения договора аренды | После оплаты стоимости предмета аукциона в течение 2 рабочих дней |
| 9 | Начальная (стартовая) цена продажи | Лот № 1 – 800 000 000 рублей |
| 10 | Условия аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть индивидуальные предприниматели, юридические лица.<br>Безвозмездная передача в собственность Смолевичского райисполкома 7% общей площади жилых помещений в многоквартирном жилом доме (п.1.5 решения Миноблисполкома от 14 ноября 2014 г. № 978).<br>В) При проектировании и строительстве учесть регламент использования и застройки земельного участка, установленный градостроительным паспортом |
| 11 | Наличие инженерной инфраструктуры | Лот № 1 – электроснабжение, газоснабжение, водоснабжение, централизованное водоотведение |
| 12 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| 13 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной стартовой ценны на р/с 3641000000205 ЦБУ 621 филиала № 616 АСБ «Беларусбанк», г. Жодино, код 812, УНП 600014139 ОКПУ 04064735, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») |

**Затраты на организацию и проведение аукциона в том числе (изготовление землеустроительного дела, осуществление государственной регистрации создания земельного участка, публикация информационного сообщения, изготовление градостроительного паспорта) подлежат возмещению победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона.**

**Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком – каждый четверг с 9.00 – 13.00**

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Подлесная, д.11, каб. № 8.**

**Окончательный срок приема заявлений – 22.05.2015 г. 17.00.**

**Контактный телефон (8-01776) 55-3-42.**

**Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:**

- заявление на участие в аукционе;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели и юридические лица, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом в его участии.**



Помнік жыхарам вёсак Жураўкавічы і Падгор'е, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны.

# ПА ГЭТАЙ ДАРОЗЕ МОЙ БАЦЬКА І Я ПАЙШЛІ НА ВАЙНУ...

**«Па гэтай дарозе мой бацька і я пайшлі на вайну», — першае, што сказаў у мікрафон Канстанцін Анісімавіч Патапчык. У дынаміках толькі што гучалі песні ваенных гадоў, таму ўзвышаны голас ветэрана здаўся іх хвалюючым працягам.**

Так і гэты дзень для жыхароў вёскі Жураўкавічы стаў працягам у чарадзе дзясяткаў тысяч дзён, якія аддзялілі іх ад ваеннага ліхалецця. У той жа далечыні назаўжды засталіся і многія іх аднавяскоўцы.

«Гэтая дарога мне бачылася ў снах на фронце. Я стаў кулямётчыкам. Пад Аўгустовам у Польшчы атрымаў цяжкае раненне...» — працягваў Канстанцін Анісімавіч. Ён расказваў, як на той жа чужой зямлі ў баях з агульным ворагам загінуў бацька. Яго магілу адшукаць не ўдалося.



Па гэтай дарозе вяскоўцы ішлі на фронт.

«Я пакляўся сабе ўвекавечыць памяць бацькі і іншых палеглых землякоў у мемарыяльным знаку, каб перадаць святую памяць пра іх наступным пакаленням. Цяжка было здзяйсняць задуманае. Доўга шукаў на палях падыходзячы магутны валун. Шукаў магчымасць яго перавозкі ў вёску, устаноўку на пляцоўку, якую таксама трэба было падрыхтаваць па належнай тэхналогіі. Не ведаю, колькі б рабіў усё гэта адзін, калі бы да справы не далучыўся цудоўны чалавек — пісьменнік і краязнавец Іван Паўлавіч Ярашэвіч. Разам мы ўсюды знаходзілі паразуменне, атрымлівалі дапамогу», — так гаварыў у мікрафон ветэран. Перад ім стаялі аднавяскоўцы, сябры па працоўных гадах з Мінскага аўтазавода, прадстаўнікі мясцовай улады. А за спіною ветэрана высіўся новы помнік. Магутны камень, нібы сцяг, нёс на сабе імёны трыццаці двух вяскоўцаў. Праз хвіліну Канстанцін Анісімавіч разам са сваімі праўнучкамі зняў з помніка покрыва і ўсклаў да падножжа першыя кветкі.

Адкрыццё такога помніка на вясковай вуліцы — прыкметны радок на старонках нашай агульнай Памяці. Для таго, каб усё гэта адбылося, спатрэбілася Асоба — шчыры, неабыякавы чалавек, які на сваім лёсе зведаў жахі вайны, ветэран Канстанцін Анісімавіч Патапчык. Разам са сваім аднадумцам Іванам Паўлавічам Ярашэвічам яны доўга пералічвалі па памяці прозвішчы людзей, назвы арганізацый і прадпрыемстваў, дзе за апошнія гады атрымлівалі падтрымку ў задуманай справе. Дапамога была вялікай і малой, але ўрэшце — неабходнай, каб імёны абаронцаў-аднавяскоўцаў з'явіліся на мемарыяльнай дошцы.

**Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.**
*Смілавіцкі сельсавет Чэрвеньскага раёна.*



Для ўдзелу ў адкрыцці помніка прыехала намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Аксана Уладзіміраўна НЯХАЙЧЫК, якая перадала Канстанціну Анісімавічу ПАТАПЧЫКУ ганаровы знак «За развіццё ветэранскага руху» (злева на фота — Іван Паўлавіч ЯРАШЭВІЧ).

■ Зусім сакрэтна

# Калгаснае будаўніцтва: выратаваць індустрыялізацыю

**Шануючы памяць аб ахвярах вялікіх войнаў, што грымелі па свеце, мы амаль не ўспамінаем тых, хто пацярпеў ад войнаў неабвешчаных, для якіх не былі характэрнымі баявыя дзеянні, але ахвярамі якіх сталі мільёны людзей. Менавіта ў такое супрацьстаянне вылілася распачатая ў Савецкім Саюзе напрыканцы 1920-х гадоў новая аграрная палітыка, вядомая як калектывізацыя. Разам з галоўным архівістам Нацыянальнага архіва Беларусі Вячаславам СЕЛЯМЕНЕВЫМ «Звязда» распачынае рубрыку «Зусім сакрэтна», дзе будзе прадстаўлены цыкл матэрыялаў пра вялікае калгаснае будаўніцтва і яго негатыўныя і станоўчыя наступствы. Пагартаем дакументы і пачнём з таго, як зараджалася калектыўная гаспадарка.**

## ХУТЧЭЙ, ВЫШЭЙ, МАЦНЕЙ

